# «Цяплом вясны сагрэтая…»
## Вандроўка на літаратурнай машыне часу
## (па творчасці Эдзі Агняцвет)

**Складальнік:** Якуш А. Л.,
бібліятэкар першай катэгоры
філіяла гарадская бібліятэка № 3

**Чытацкае прызначэнне**: вучні малодшых і сярэдніх класаў.

**Мэта**: прадэманстраваць сваю любоў і павагу да беларускай мовы, у чарговы раз звярнуць увагу на яе прыгажосць, мілагучнасць, адчуць смак і энергію беларускага слова і пазнаёміцца з творчасцю вядомай дзіцячай беларускай паэткі Эдзі Сямёнаўны Агняцвет.

**Афармленне і абсталяванне:** камп'ютар, выстава-партрэт «Гэта - і сэрца, і розум, неба маё і зямля…», крыжаванка «Агняцвет» (рэчы-падказкі), нацыянальны беларускі касцюм для дзяўчынкі, карткі з тэкстам вершаў «Кто начинает день?» для перакладу з рускай мовы на беларускую, «Грамацеі», «Алоўкі», «Малююць дзеці», алоўкі, папера для малявання.

### Ход мерапрыемства

**Вядучы:** Добры дзень, шаноўныя чытачы! Ці вандравалі вы калі-небудзь на літаратурнай машыне часу? Не? Тады зараз – самы час. Зручней уладкоўвайцеся і мы выпраўляемся ў літаратурную вандроўку ў часе і прасторы. Абавязкова возьмем з сабой цудоўныя кнігі вядомай дзіцячай паэткі Эдзі Агняцвет і станем даследчыкамі яе творчасці.

Увага! 3! 2! 1! Старт!

### Першы прыпынак. 1913… Пачатак.

Імя Эдзі Агняцвет вядома не толькі ў нас, нашым чытачам, але і далёка за межамі Беларусі. Яе кнігі напісаны з любоўю і дабром да сваіх чытачоў. На старонках гэтых кніг многа сонца, многа святла, многа дабрыні і бесклапотнага дзіцячага смеху і жартаў.

Нарадзілася Эдзі Агняцвет 11 кастрычніка у Мінску ў 1913 годзе.Тут прайшлі і дзяцінства і юнацтва. Бацька працавау прарабам на лесанарыхтоуках, а маці Эдзі працавала у тыя гады бібліятэкарам у Пушкінскай бібліятэцы. І таму першымі самымі адданымі сябрамі будучай паэтэсы былі кнігі. Яна бясконца многа чытала.

Сапраўднае прозвішча Эдзі Агняцвет - Эдзі Сямёнаўна Каган. А псеўданім выбрала сабе дзякуючы захапленню паэмай Якуба Коласа «Сымон-музыка».

*Вядучы дэманструе фотаздымак папараць-кветкі.*

Папараць-кветка - у беларускай міфалогіі чароўная расліна, якая надавала чалавеку магічныя якасці: ён пачынаў разумець мову жывёл і дрэў, бачыць скрозь зямлю схаваныя скарбы, лячыць людзей ад розных хвароб, ведаць будучыню і інш. Кветка быццам з'яўляецца ў купальскую ноч.

Атрымаўшы папараць-кветку, чалавек набудзе здольнасць бачыць тое, што іншым нябачна, стане мудрым. Папараць ніколі не квітнее, але яе споры часам выпраменьваюць маленькае свячэнне. Гэта адносіцца толькі да рэдкай каралеўскай папараці, якой сёння ў Беларусі амаль не засталося - яна захавалася, у прыватнасці, у Белавежскай пушчы і занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі.

З яе і ўзяла імя Эдзі, якое адпавядала настрою (першыя вершы пад гэтым псеўданімам апублікавала ў 1929 г.) - жыць узнёсла, не забываючы, што новы свет магчыма пабудаваць толькі людзьмі, рамантычна акрыленымі, адданымі справе.

Вядомая беларуская паэтэса Эдзі Агняцвет піша для дзяцей і дарослых. «Маё пакаленне» - так называецца яе першы зборнік, што выйшаў у 1935 г.

Захапленне прыродай і кнігай, жывым беларускім словам, якое гучала дома, у бібліятэцы і ў школе, заахвоціла дзяўчынку да самастойнай вершаванай творчасці. Выкладчык беларускай літаратуры, пазнаёміўшыся з вершамі сваёй вучаніцы, параіў ёй звярнуцца да Янкі Купалы. З вялікай удзячнасцю ўспамінае Эдзі Агняцвет хвалюючую першую сустрэчу з народным паэтам, яго парады і падтрымку. У школьныя гады будучую паэтэсу зачаравалі таксама творы другога народнага паэта - Якуба Коласа.

## Другі прыпынак. 1941-1945 . «Навечна ў памяці народнай»

Паэтэса перажыла вайну. У тыя суровыя гады яна трапіла ва Узбекістан. Са сваімі творамі аб родным краі, аб савецкіх людзях, што змагаюцца з фашысцкім нашэсцем, часта выступала перад воінамі ў шпіталях. Ваенныя творы Э. Агняцвет склалі зборнікі вершаў «Другу на фронт», «Простыя песні», «Міхасёк». Многія вершы пакладзены на музыку.

Паслухайце адну з іх і адкажыце аб чым або аб кім ідзе гаворка.

*У выкананні ВІА «Песняры» гучыць песня «Міша Камінскі».*

(https://www.youtube.com/watch?v=PhmsxEDKObs)

*Гучыць адказы дзяцей.*

**Вядучы** дапаўняе:

Ні на адной самай падрабязнай геаграфічнай карце вы не знойдзеце сёння гэтай беларускай вёскі. Яна была знішчана фашыстамі вясной 1943 года. Гэта адбылося 22 сакавіка 1943 года. Азвярэлыя фашысты ўварваліся ў вёску Хатынь і абкружылі яе. Жыхары вёскі нічога не ведалі аб тым, што раніцай за 6 км ад Хатыні партызаны абстралялі аўтакалону гітлераўцаў і ў выніку нападзення быў забіты нямецкі афіцэр.

Але ні ў чым не павінным людзям фашысты ўжо вынеслі смяротны прысуд. Усё насельніцтва Хатыні ад малога да вялікага – старых, жанчын, дзяцей - выганялі з хат і гналі ў калгаснае гумно. Прыкладамі аўтаматаў падымалі хворых, старых, не шкадавалі жанчын з маленькімі дзецьмі і немаўлятамі. Ні адзін дарослы не змог застацца незаўважаным. Толькі траім дзецям ўдалося схавацца ад гітлераўцаў.

Калі ўсе жыхары вёскі былі ў гумне, фашысты запёрлі дзверы, аблажылі будыніну саломай, аблілі бензінам і падпалілі. Драўлянае гумно імгненна загарэлася. У дыме задыхаліся і плакалі дзеці. Дарослыя спрабавалі ратаваць іх. Пад націскам дзесяткаў чалавечых цел не вытрымалі і ўпалі дзверы. У ахопленым агнём адзенні, апанаваныя жахам, людзі кінуліся бегчы, але тых, хто вырываўся з полымя, фашысты расстрэльвалі з аўтаматаў і кулямётаў. Загінулі 149 чалавек, з іх 75 дзяцей да 16-гадовага ўзросту. Вёска была разрабавана і спалена.

Адзіны дарослы сведка хатынскай трагедыі - 56-гадовы вясковы каваль Іосіф Камінскі, абгарэлы, паранены, апрытомнеў позна ноччу, калі фашыстаў ужо не было ў вёсцы. Яму давялося перажыць яшчэ адзін цяжкі ўдар: сярод трупаў аднавяскоўцаў ён знайшоў свайго параненага сына. Хлопчык быў смяротна паранены ў жывот, атрымаў моцныя апёкі. Ён памёр на руках у бацькі. Гэты трагічны момант з жыцця Іосіфа Камінскага пакладзены ў аснову стварэння адзінай скульптуры мемарыяльнага комплексу «Хатынь» – «Няскораны чалавек».

Даўно адгрымелі ваенныя залпы. Зараслі акопы. І няма, адышлі ўжо з жыцця многія і многія ветэраны… А тая трывога,той боль не сціхае  і па сёння. Мы павінны заўсёды помніць аб гэтым і шанаваць мір на нашай зямлі.

## Трэці прыпынак. 1977…

Вярнуўшыся пасля вайны ў Мінск, Эдзі Агняцвет актыўна працуе ў галіне лірычнай элегіі, дзіцячай літаратуры і мастацкага перакладу. Яна шмат твораў пераклала на беларускую мову з рускай, украінскай, літоўскай, узбекскай, татарскай, латышскай, а таксама з французскай. Сярод іх асобныя творы А. Пушкіна, М. Някрасава, У. Маякоўскага і «Маленькага прынца” А. Экзюпе
ры. За пасляваенны час выйшлі ў свет зборнікі «Край мой родны» (1945), «Дарога ў будучыню» (1949), «Твае таварышы» (1957), «Беларуская рабіна» (1959), «Лірыка» (1965), «Круглы год» (1966), «Першы ліст» (1966), «Падарожнік» (1969), «Піянерская гама» (1970), «Жаданне» (1971), «Мы вясёлыя, мы сур’ёзныя» (1976) і інш.

Паэтэса здолела ўбачыць надзвычайныя рысы дзяцей, якія адразу вызначалі характары дзейсных асоб. Цяжка ўявіць дзіцячую паэзію без усмешкі, без гумару. Найбольш характэрныя з іх «Зося на кухні», «Параска і падказка», «Вельмі «ветлівы» Мікіта». Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту выдадзена цэлая кніжка падобных твораў «Доктар Смех», малюнкі для якой выкананы дзецьмі, вучнямі Рэспубліканскай школы-інтэрната.

*Наступнае заданне: прачытаць верш «Грамацеі» і выправіць памылкі.*

Саня – першы грамацей,
А за ім ідзе Мацей.
Саня піша: «Роўна ў восім
На футбол з’евіцьца просім».
– Непісьменная аб’ява,
Класу нашаму – няслава!
Раззлаваўся грамацей.
Перапісвае Мацей:
«У нідзелю роўна ў восям
На футбол з’явіца просям».
– І куды вы ўсе глядзелі?
Не ў «нідзелю»,
А ў «недзелю», –
Хомка – трэці грамацей –
Напісаў яшчэ прасцей.
Цэлы стос паперы чыстай
Сапсавалі футбалісты...

*Дзеці выконваюць заданне.*

Шумны свет дзіцячай паэзіі Эдзі Агняцвет населены не толькі самімі дзецьмі, але і дарослымі: тут створаны вобразы бацькі, маці, дзеда, настаўніцы - «Твая настаўніца», скульптара, шафёра. Паэтэса расказвае дзецям пра рабочага чалавека, пра розныя прафесіі - «Хто пачынае дзень?».

*А цяпер вам заданне: я прапаную вам адчуць сябе у ролі перакладчыка  і перакласці верш «Кто начинает день?» з рускай мовы на беларускую.*

*Дзеці выконваюць заданне.*

## Чацвёрты прыпынак. 1986-1998

Пісьменніцкую працу паэтэса спалучае з грамадскай дзейнасцю; сустракаецца з чытачамі ў школах, бібліятэках, на прадпрыемствах рэспублікі, удзельнічае ў рабоце

секцыі літаратуры для дзяцей і юнацтва, выступае па радыё і ў друку. Тэматыка вершаў і паэм Э. Агняцвет досыць шырокая: Вялікая Айчынная вайна з яе трагедыямі; гераізм дзяцей і дарослых; адбудова разбуранай сталіцы Беларусі Мінска; мірная стваральная праца; дружба, інтэрнацыянальная еднасць працоўных; піянерскае дзяцінства. У яе творчасці для дзяцей і юнацтва ёсць розныя жанры: лірычны, апавядальна-сюжэтны, сатырычны верш, верш-дыялог, песня, опернае лібрэта, паэма. Дзіцячыя паэмы паэтэсы часцей за ўсё ўслаўляюць гераічнае ў нядаўняй гісторыі нашага народа, выхоўваюць у дзяцей смеласць, мужнасць.

У 1986 годзе Эдзі Агняцвет за кнігу «На двары Алімпіяда» быў прысуджаны Міжнародны ганаровы Дыплом імя Ханса Крысціяна Андэрсана. Атрымаць такую ўзнагароду - вялікі гонар. Яна прысуджаецца за найбольш яскравыя творы, якія садзейнічаюць выхаванню дзяцей, фарміраванню іх унутранага свету, паказваюць дзяцінства ва ўсёй яго непаўторнасці. «На дворы Алімпіяда» - гэта цэласная кніга пра дзяцей свайго двара, іх клопаты, захапленні, мары і жаданні. Паэтка лічыла: «Свет дзяцей вельмі разнастайны і шматгранны, паказаць яго - значыць паказаць дзяцей такімі, якія яны ёсць насамрэч». У кнізе ёсць раздзел «Рукі сяброў», дзе змешчаны ўласныя пераклады тых паэтаў, каго больш за ўсё любіла Эдзі Агняцвет. Сярод іх - Сяргей Міхалкоў, Багдан Чалы, Юльян Тувім.

У 1988 годзе выходзіць кніга «Хай часцей смяюцца дзеці».

Я прапаную вам паглядзець відэаролік з чытаннем гэтага верша. (https://www.youtube.com/watch?v=isHuzDOaRok)

*Прагляд відэа.*

А зараз я для вас падрыхтавала крыжаванку па гэтай кнізе. Вам патрэбна адгадаць назвы вершаў. Гэта значыць знайсці, прачытаць верш і разгадаць крыжаванку. Падказкі знаходзяцца на стале і кніга таксама.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | **А** | | | | | | | |
| | | | | 2 | **Г** | | | | | | | |
| | 3 | | | | **Н** | | | | | | | |
| 4 | | | | | **Я** | | | | | | | |
| | | | | 5 | **Ц** | | | | | | | |
| | | | | 6 | **В** | | | | | | | |
| | | | 7 | | **Е** | | | | | | | |
| | | | | 8 | **Т** | | | | | | | |

*Адказы:* 1. Алеся, 2. Гармонік, 3. Ручнік, 4. Акуляры, 5. Цыбуліна, 6. Васількі, 7. Хлеб, 8. Стол.

**Вядучы:** Малайцы!

**Пяты прыпынак. 2000-я гады**

У Эдзі Агняцвет асаблівае пачуццё прыроды, разам з ёй мы дзівімся бэзавай галінкай, на якой пабліcквае вочкам-пацерачкай птушаня, мы дзівімся зялёнаму жыццю, якое бурліць. Яна вельмі любіць сваю Беларусь. Давайце прачытаем верш «Алоўкі» і намалюем нашы родныя краявіды .

*Дзеці малююць.*

На вялікі жаль, паэтэсы ўжо няма з намі, але яе цудоўныя вершы не перастаюць нас радаваць і хваляваць.

Адна з вашых аднакласніц падрыхтавалася і зараз прачытае верш Эдзі Агняцвет «Зямля з блакітнымі вачамі». Паслухайце.

*Вучаніца чытае верш.*

**Вядучы:**

Вось і закончылася наша вандроўка па творчасці беларускай паэткі Эдзі Агняцвет. Звярніце, калі ласка, увагу на выставу-партрэт «Гэта - і сэрца, і розум, неба маё і зямля…». Чытайце гэтыя цудоўныя кнігі. Жывое, яскравае паэтычнае слова паэткі натхняе кожнага з нас любіць і шанаваць родную зямлю.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. Агняцвет Эдзі // Беларускія пісьменнікі (1917—1990) : Даведнік / склад. А. К. Гардзіцкі ; нав. рэд. А. Л. Верабей. - Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. - С. 6-8.

2. Агняцвет, Э. [Верш] / Эдзі Агняцвет // Багдановіч М. Пясняр чыстае красы : успаміны, артыкулы, прысвячэнні. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2011. - С. 245.

3. Барсток, М. М. Эдзі Агняцвет / М. М. Барсток // Беларуская дзіцячая літаратура : вучэбны дапаможнік / пад агул. рэд. М. Б. Яфімавай, М. М. Барсток. - 2-е выд., дапрац. і дап. - Мінск, 1980. - С. 302-317.

4. Дзень добры, мама! : словы адданасці і любові : зб. вершаў беларус. сав. паэтаў : для сярэд. і ст. шк. узросту / уклад. У. Васілевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1977. - 190 с.

5. Мая зямля ад «А» да «Я» : для сярэд. і ст. шк. узросту / аўтары тэксту К. С. Півавар, Г. А. Арцямёнак. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Пятруся Броўкі, 2021. – С. 100.

6. Огнецвет Эди Семёновна [Электронный ресурс] // Наши люди : сайт. – Минск, [2021-2023], - Режим доступа: https://nashi-lyudi.by/person/ognecvet-edi-semenovna/. – Загл. с титул. экрана. – Дата обращения: 12.02.2023.

7. Презентация к уроку литературного чтения. Эди Огнецвет. Биография писателя. [Электронный ресурс] // Мультиурок : сайт. – Режим доступа: https://multiurok.ru/files/prezentatsiia-k-uroku-literaturnogo-chteniia-edi-o.html. – Загл. с титул. экрана. – Дата обращения: 08.02.2023.

8. Переводчик Эди Огнецвет (Эдзі Агняцвет) [Электронный ресурс] // Лаборатория фантастики : [сайт]. - Режим доступа: https://fantlab.ru/translator15387. - Загл. с титул. экрана. – Дата обращения: 17.02.2023.